УДК 94(476)+94(100)«1914/1917»

**Я. А. Бодрыкаў**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА СЕМ'ЯМ МАБІЛІЗАВАНЫХ НІЖНІХ ЧЫНОЎ І РАТНІКАЎ АПАЛЧЭННЯ Ў МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ЛІПЕНЬ 1914 – САКАВІК 1917 Г.)

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца вызначэнне памераў, метадаў і форм сацыяльнай дапамогі сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння ў Мінскай губерні з боку дзяржаўных інстытутаў і грамадскіх арганізацый. Тэма не распрацавана ў айчыннай гістарыяграфіі і толькі ўскосна закранаецца ў замежных даследаваннях па сацыяльнай палітыцы Расійскай імперыі. У даследаванні звяртаецца ўвага, што дзяржаўнай дапамогі для падтрымання сем'яў мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння было недастаткова, таму дзяржава актыўна заклікала да ўдзелу грамадскія і прыватныя арганізацыі. Дапамога з боку апошніх істотна зменшылася ўжо з лета – восені 1915 г. па прычыне набліжэння лініі фронту да Мінскай губерні і акупацыі часткі яе паветаў у верасні 1915 г.

Сістэма сацыяльнай дапамогі ў Мінскай губерні не была цэнтралізаванай і мела вялікую залежнасць ад настрояў і дабрабыту грамадства, якія за перыяд Першай сусветнай вайны толькі пагоршыліся. Кардынальныя змены ў сістэме сацыяльнай дапамогі сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння адбыліся толькі пасля падзей Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і ўсталявання Часовага ўрада.

**Ключавыя словы**: мабілізацыя, сацыяльная дапамога, Закон 25 чэрвеня 1912 г., папячыцельства, дабрачыннасць.

**Для цытавання:** Бодрыкаў Я. А. Сацыяльная дапамога сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння ў Мінскай губерні падчас Першай сусветнай вайны (ліпень 1914 – сакавік 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 1 (269). С. 55–61. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-10.

**Ya. A. Bodrykau**
Belarusian State University

# SOCIAL ASSISTANCE TO THE FAMILIES OF MOBILIZED LOWER RANKS AND MILITIA WARRIORS OF MINSK PROVINCE DURING THE FIRST WORLD WAR (JULY 1914 – MARCH 1917)

The purpose of this research is to determination the dimensions, methods and forms of social assistance to the families of mobilized lower ranks and militia warriors in Minsk province from state institutions and public organizations. The topic is not developed in domestic historiography and is only indirectly involved upon in foreign studies on the social policy of the Russian Empire. The research draws attention to the fact that the state assistance at supporting families of mobilized lower ranks and militia warriors was insufficient, so the state actively called for the participation of public and private organizations. Assistance from the latter has been significantly reduced since the summer–autumn of 1915 due to the approach of the front line to the Minsk province and the occupation of part of its districts in September 1915.

The system of social assistance in the Minsk province was not centralized and was highly dependent on the mood and well-being of society, which only worsened during the First World War. Fundamental changes in the system of social assistance to the families of mobilized lower ranks and militia warriors occurred only after the events of the February Revolution of 1917 and the establishment of the Provisional Government.

**Keywords:** mobilization, social assistance, the Law of June 25, 1912, guardianship, well-being.

**For citation:** Bodrykau Ya. A. Social assistance to the families of mobilized lower ranks and militia warriors in Minsk province during the First World War (July 1914 – March 1917). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 1 (269), pp. 55–61 (In Belarusian). DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-10.

**Уводзіны.** Ваенныя канфлікты другой паловы XIX – пачатку XX ст. патрабавалі ад еўрапейскіх дзяржаў перыядычнага папаўнення рэгулярных армій праз мабілізацыю часткі мужчынскага насельніцтва. Гэты працэс спрыяў павелічэнню колькасці войска, аднак негатыўна ўплываў на эканамічны стан большасці сем'яў, якія вымушаны былі адпраўляць сваіх працаздольных

мужчын на вайну. Дапамога з боку дзяржавы і грамадства сем'ям мабілізаваных не толькі дазваляла пазбегнуць масавага збяднення шматлікіх гаспадарак гэтых сем'яў, але і падтрымлівала сацыяльную стабільнасць у дзяржаве, а таксама станоўча ўплывала на баявы дух сярод вайскоўцаў. У Расійскай імперыі сацыяльная дапамога сем'ям мабілізаваных салдат упершыню на заканадаўчым узроўні была ўведзена ў 1874 г. Аднак руска-японская вайна 1904–1905 гг. выявіла хібы ў сістэме сацыяльнай дапамогі сем'ям мабілізаваных вайскоўцаў, таму 25 чэрвеня (8 ліпеня) 1912 г. было прынята новае Палажэнне аб апекаванні ніжніх чыноў і іх сем'яў (вядомае таксама як Закон 25 чэрвеня 1912 г.) [1, с. 30]. Згодна з дакументам, дапамога выдавалася членам сем'яў ніжніх чыноў, якіх прызвалі ў войска пры мабілізацыі; затрыманых у войску больш за тэрмін абавязковай службы з-за мабілізацыі; ратнікаў дзяржаўнага апалчэння, адпраўленых на вайсковую службу, і тых, хто пaступаў на службу ў ваенныя дружыны. На безумоўную дапамогу маглі разлічваць толькі афіцыйныя жонкі і «законныя» дзеці (да 17-гадовага ўзросту) мабілізаваных ніжніх чыноў. Разлічваць на дапамогу маглі бацькі, браты і сёстры, дзяды і бабкі мабілізаванага, калі яны «ўтрымліваліся працай апошняга». Жонкі і дзеці ніжніх чыноў, якія згубілі працаздольнасць або загінулі на вайне, атрымлівалі права на пенсію. Дзяржаўная дапамога выдавалася ў грашовым эквіваленце кошту харчовага пайка ў памеры 1 пуда 28 фунтаў мукі (каля 29 кг), 10 фунтаў круп (4,5 кг), 4 фунтаў солі (1,8 кг) і 1 фунта поснага алею (0,45 л) на месяц на чалавека. Дзецям да 5 гадоў такая дапамога выдавалася ў палавінным памеры. Пазашлюбныя дзеці і жонкі, пасынкі, падчарыцы і прыёмныя дзеці не мелі права на дзяржаўную дапамогу, але маглі разлічваць на харчовы паёк з грамадскіх і дабрачынных сродкаў [2, с. 431]. У 1915 г. выйшла новае Палажэнне, згодна з якім сем'і дэзерціраў і вайскоўцаў, якія добраахвотна здаліся ў палон, пазбаўляліся дзяржаўнай дапамогі. Акрамя таго, харчовы паёк не выдаваўся сем'ям ніжніх чыноў, якія яшчэ да вайны былі прызваныя на тэрміновую службу і працягвалі адбываць яе. Аднак сем'ям такіх ніжніх чыноў, якія апынуліся ў гаротным становішчы, маглі аказваць дапамогу дабрачынныя арганізацыі. Дапамога сем'ям мабілізаваных не абмяжоўвалася грашовымі выплатамі на харчаванне ад дзяржавы і мела розныя формы і памеры.

**Асноўная частка.** Усеагульная мабілізацыя ў Расійскай імперыі пачалася 18 (31) ліпеня 1914 г., за два дні да афіцыйнага абвяшчэння Мікалаем II вайны Германскай імперыі [3, с. 17]. З гэтага часу пачалося стварэнне сеткі дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый дапамогі сем'ям мабілізаваных у Мінскай губерні. Для апекавання над сем'ямі мабілізаваных у сельскай мясцовасці абіраліся валасныя папячыцельствы, а ў выпадку іх адсутнасці гэтыя функцыі ўскладваліся на валаснога старшыню. Згодна з законам ад 25 чэрвеня 1912 г., валасны сход павінен быў абраць не менш чым тры чалавекі (не маладзейшых за 25 гадоў) у склад валаснога папячыцельства. Аднак у некаторых выпадках з-за актыўных сельскагаспадарчых работ, мабілізацыі і малой зацікаўленасці з боку сялян валасныя папячыцельствы не ствараліся [2, с. 437].

Асноўнай задачай валаснога папячыцельства было абследаванне складу і ўмоў жыцця сем'яў мабілізаваных. Кантроль за дзейнасцю валасных папячыцельстваў належаў земскім участковым начальнікам. Валасныя папячыцельствы павінны былі даследаваць сем'і і гаспадаркі ў 2-тыднёвы тэрмін са дня абвяшчэння мабілізацыі. Непасрэднае рашэнне аб ўсталяванні канкрэтнай сумы выплат кожнай сям'і на падставе інфармацыі, сабранай на валасным узроўні, прымаў павятовы з'езд, пасля гэтага дадзеныя перадаваліся ў губернскую прысутнасць. Аднак ужо 29 жніўня (11 верасня) 1914 г. выйшаў указ, згодна з якім функцыі павятовых з'ездаў у справе выдачы дзяржаўнай дапамогі пераходзілі да адпаведных павятовых папячыцельстваў ці павятовых земскіх управаў. Непасрэдна сем'ям мабілізаваных у сельскай мясцовасці грошы выдаваліся 4 разы ў год: у сакавіку, чэрвені, верасні і снежні праз валаснога старшыню. Варта адзначыць, што апошнія часам злоўжывалі сваімі абавязкамі і забіралі частку грашовай дапамогі сабе. Такія выпадкі, напрыклад, былі зафіксаваны ў Ігуменскім павеце [1, с. 192].

У гарадах Расійскай імперыі функцыі па зборы інфармацыі аб становішчы сем'яў мабілізаваных ускладваліся на гарадскія ўправы ці гарадскіх стараст, аднак па рашэнні мясцовых уладаў маглі быць створаны і адпаведныя камісіі ці асобныя папячыцельствы. Як і ў сельскай мясцовасці, гэтыя органы павінны былі збіраць інфармацыю пра колькасны і гаспадарчы стан сем'яў мабілізаваных і на працягу вайны сачыць за зменамі па гэтых параметрах. У гарадах грашовыя выплаты адбываліся штомесяц. Нагляд за дзейнасцю ўсіх дзяржаўных органаў па дапамозе сем'ям мабілізаваных у межах кожнай губерні належаў непасрэдна губернатару. Разам з тым нярэдка выдача дапамогі адкладвалася, бо чыноўнікі няправільна тлумачылі закон ад 25 чэрвеня (8 ліпеня) 1912 г. [4, с. 150].

У Мінску функцыі гарадскога папячыцельства належалі Мінскаму гарадскому камітэту грамадскай дапамогі сем'ям ніжніх чыноў запасу

арміі і ратнікаў дзяржаўнага апалчэння, прызваных на дзейсную службу. Камітэт быў створаны па ініцыятыве Мінскага гарадскога галавы Хржанстоўскага С. Б. у першыя дні вайны і ўключаў у свой склад вядомых у горадзе грамадскіх і рэлігійных дзеячаў. Першапачаткова арганізацыя збірала грошы на дапамогу выключна праз ахвяраванні. Акрамя таго, дзеячы Камітэта зрабілі абследаванне гарадскіх сем'яў мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння. Мінская гарадская дума 10 (23) верасня 1914 г. пастанавіла прызнаць Камітэт гарадскім папячыцельствам і дэлегавала ў яго склад 5 дэпутатаў [5, с. 1–6].

Згодна з апублікаванай справаздачай, за перыяд дзейнасці ў 1914 г. Камітэтам былі абследаваны ўмовы жыцця 2400 сем'яў, з якіх 1693 (70,54%) атрымалі грашовую дапамогу. Агульная сума грошай, на якую Мінскі камітэт аказаў дапамогу, на 1 (14) студзеня 1915 г. склала 15 182 руб. 10 кап., або амаль 9 руб. у сярэднім на адну сям'ю. Самі прадстаўнікі Камітэта ў сваёй справаздачы адзначалі, што «лічба гэта не можа не ўразіць сваёй нязначнасцю» [5, с. 6–12]. Грашовыя выплаты для сем'яў у іншых частках губерні адрозніваліся не істотна і залежалі ў першую чаргу ад колькасці дзяцей у сям'і і іх узросту. Усяго на снежань 1914 г. у Мінскай губерні налічвалася 6480 сем'яў, якія атрымлівалі харчовую дапамогу [6, арк. 4]. Аднак на працягу вайны гэта лічба паступова мянялася. Пры Мінскім Гарадскім Камітэце былі створаны дзве дапаможныя арганізацыі: Бюро працы і Саюз моладзі. Апошняя займалася зборам ахвяраванняў у выглядзе наяўных грошай, цёплай вопраткі, бялізны, харчавання, кніг і часопісаў не толькі для сем'яў мабілізаваных, але і для саміх франтавікоў, а таксама для бежанцаў. Разам з тым Саюз моладзі арганізоўваў дабрачынныя мерапрыемствы, значная частка даходу з якіх ішла на сацыяльную дапамогу [7, арк. 1–3].

Падобныя да Мінскага гарадскога камітэта папячыцельскія арганізацыі ствараліся і ў іншых гарадах губерні, аднак іх праца не была такой актыўнай і заўважнай. Акрамя таго, ужо з вясны-лета 1915 г. колькасць ахвяраванняў істотна скарацілася, што звужала і поле дзейнасці адпаведных арганізацый [7, арк. 4].

У жніўні 1914 г. уладамі Мінскай губерні быў устаноўлены памер пайка для сем'яў мабілізаваных у 2 руб. 77 кап. на чалавека, што было крыху больш за сярэднюю суму па Расійскай імперыі [2, с. 456]. Разумеючы неабходнасць не толькі харчовай дапамогі, губернскі земскі сход пастанавіў дадаткова выдаваць сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння, якія не маюць свайго жылля, па 3 руб. у месяц на арэнду і абагрэў памяшкання. Такая сума першапачаткова дапамагала вырашыць жыллёвае пытанне для адзначаных сем'яў, аднак з цягам часу цэны на арэнду і паліва толькі павялічваліся. У лістападзе 1914 г. урад афіцыйна даў дазвол на бясплатную выдачу ламачча і сухастою. Губернскія ўлады выдавалі сем'ям мабілізаваных дровы. Дадатковыя выплаты па рашэнні губернскага земскага сходу аднаразова выдаваліся сем'ям без уласных палявых гаспадарак; сем'ям, у якіх быў мабілізаваны адзіны працаздольны мужчына; а па рашэнні Мінскага павятовага земства таксама 1457 сем'ям на апрацоўку і асемяненне палёў [8, арк. 9–27].

Імкнуліся аказваць дапамогу сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і мясцовыя гарадскія думы, якія займаліся апекай пераважна тых сем'яў, якія не атрымлівалі дзяржаўнай дапамогі. Так, у 1914 г. Мінская гарадская дума асігнавала 310 руб. на 95 сваякоў мабілізаваных (3 руб. 26 кап. на чалавека) у месяц, Бабруйская гарадская дума – 138 руб. 50 кап. на 26 сем'яў (5 руб. 32 кап. на сям'ю), Мазырская гарадская дума выдавала 7 чалавекам суму ў памеры «харчовай дапамогі» ў межах губерні (2 руб. 77 кап. на чалавека) [8, арк. 25–26 адв.].

Дзяржаўная дапамога выдавалася з разлікам пакрыцця расходаў на харчаванне. У той жа час многія сем'і мелі патрэбу ў дадатковых выплатах для набыцця вопраткі і прадметаў побыту, адпраўкі дзяцей у школу. Акрамя таго, дапамога патрабавалася пазашлюбным жонкам і дзецям мабілізаваных або далёкім сваякам, падтрымка якіх не прадугледжвалася за дзяржаўны кошт. Гэта спрыяла стварэнню на тэрыторыі Мінскай губерні сеткі грамадскіх і царкоўных дабрачынных арганізацый, якія аказвалі дадатковую грашовую дапамогу адзначаным вышэй сваякам мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння.

Летам 1914 г. у Мінскай губерні пачалася праца першых прыходскіх папячыцельстваў пад кіраўніцтвам мясцовых святароў Рускай праваслаўнай царквы. Святары стваралі спісы сем'яў мабілізаваных, якім патрабавалася дапамога, пасля гэтага для іх збіраліся ахвяраванні. Больш прадуктыўнай была праца прыходскіх папячыцельстваў у сельскай мясцовасці, бо ў вёсках царква адыгрывала больш значную ролю ў сацыяльнай і духоўнай сферах. Аднак дзейнасць многіх прыходскіх папячыцельстваў не мела працяглай актыўнасці або ўвогуле была фармальнай. Па меркаванні некаторых даследчыкаў, у большасці выпадкаў прыходскія папячыцельствы ўяўлялі сабой «ўстановы на паперы» [2, с. 440], што не дазваляе прасачыць рэальную колькасць актыўных прыходскіх папячыцельстваў у межах Мінскай губерні. У кожным канкрэтным выпадку дзейнасць такіх аб'яднанняў залежала ад актыўнасці і сумленнасці мясцовага святара, а таксама ахвярнасці яго паствы.

Разам з тым святары розных канфесій у пачатку вайны нярэдка збіралі ахвяраванні, каб пазней перадаць іх іншым папячыцельствам ці дзяржаўным установам. Так, напрыклад, у жніўні 1914 г. Мінскі евангелісцка-лютэранскі прыход ахвяраваў на патрэбы сем'яў мабілізаваных 1000 руб. [9, арк. 45].

У гады Першай сусветнай вайны пашырылася дабрачынная дзейнасць прадстаўнікоў манаршага дома Раманавых, якая заключалася як у ахвяраваннях і асабістым удзеле ў дабрачынных мерапрыемствах, так і патранажы дабрачынных арганізацый. Для дадатковай дапамогі сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння ўжо ў 1914 г. быў створаны Камітэт Вялікай княгіні Елізаветы Фёдараўны, вядомы як Елізавецінскі камітэт. Камітэт размяшчаўся ў Маскве, аднак яго філіялы дзейнічалі ў многіх рэгіёнах Расійскай імперыі, у тым ліку ў Мінскай губерні [8, арк. 2].

Елізавецінскі камітэт стаў адной з галоўных арганізацый для дапамогі сем'ям мабілізаваных, якія не маглі прэтэндаваць на «пайковыя» грошы ад дзяржавы ці атрымлівалі іх у недастатковым памеры. У некаторых выпадках, калі хадайнікі атрымлівалі грошы ад дзяржавы і мелі добрыя матэрыяльныя ўмовы, камітэт адмаўляў у дапамозе. Аднак са справаздачных дакументаў за люты 1915 г. бачна, што з 11 афіцыйных зваротаў да Мінскага аддзялення Камітэта дадатковую дапамогу атрымалі 9 сем'яў [9, арк. 3]. Асаблівае апекаванне ад камітэта атрымлівалі сем'і, у якіх адбываліся надзвычайныя здарэнні. Так, значную фінансавую дапамогу ад Елізавецэнскага камітэта ў Мінскай губерні атрымлівалі сем'і мабілізаваных, пацярпелыя ад пажараў. Акрамя таго, Елізавецінскі камітэт выдаткоўваў фінансы на патрэбы іншых дабрачынных арганізацый [6, арк. 3 адв.].

Яшчэ адной дабрачыннай арганізацыяй Першай сусветнай вайны пад патранажам царскай сям'і з'яўляўся Аляксееўскі камітэт. Гэта арганізацыя займалася апекаваннем дзяцей вайскоўцаў, якія загінулі на вайне або згубілі працаздольнасць, а іх маёмасць не магла забяспечыць існаванне сям'і. Дапамога ад Аляксееўскага камітэта для дзяцей адрознівалася ў залежнасці ад месца іх сталага пражывання: 24 руб. у сельскай мясцовасці, ад 24 руб. да 30 руб. у гарадах і 30–42 руб. у гарадах з насельніцтвам больш за 150 тыс. чалавек. Асаблівы статус у Мінскай губерні меў горад Бабруйск, у якім сіраты маглі атрымліваць павышаную грашовую дапамогу. Дадатковую грашовую дапамогу на вопратку і навучальныя прылады атрымлівалі дзеці, якія вучыліся ў пачатковых школах [9, арк. 21–25].

Большасць дабрачынных прыватных ці грамадскіх арганізацый губерні размяшчалася ў Мінску, бо менавіта гэты горад быў адміністрацыйным, палітычным і эканамічным цэнтрам губерні. Акрамя адзначаных вышэй арганізацый, дапамогу сем'ям мабілізаваных у Мінску аказвалі таксама Мінскае дабрачыннае таварыства імя Гасударыні Імператрыцы Аляксандры Фёдараўны, Мінскі дом працавітасці, мінскія аддзелы дапамогі пацярпелым на вайне салдатам і іх сем'ям і некаторыя іншыя арганізацыі [8, арк. 3 адв.]. Прыватная і грамадская дабрачыннасці ў павятовых гарадах былі развітыя ў меншай ступені, чым у губернскім цэнтры, і залежалі ў першую чаргу ад наяўнасці багатых мецэнатаў.

Так, у жніўні 1914 г. князь А. А. Радзівіл стварыў Нясвіжскі камітэт грамадскай дапамогі хрысціянскім сем'ям і асобам, якія маюць патрэбу ў дапамозе з прычыны вайны. Па стане на лістапад 1914 г., камітэт аказаў дапамогу 92 мясцовым жыхарам, сваякі якіх былі мабілізаваныя ў войска, на агульную суму ў 258 руб. Дапамога выдавалася ў памеры ад 2 руб. да 3 руб. на чалавека [10, арк. 22–23 адв.]. Набліжэнне лініі фронту да Нясвіжа ў 1915 г. прывяло да масавай эвакуацыі мясцовага насельніцтва. Акрамя таго, салдаты Рускай імператарскай арміі займаліся перыядычным рабаваннем княжацкай маёмасці [11, с. 83]. Гэтыя прычыны істотна ўскладнілі працу Нясвіжскага камітэта.

Некаторыя сем'і мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння не ведалі аб магчымасцях дадатковай грашовай дапамогі або не маглі напісаць афіцыйную заяву з-за сваёй непісьменнасці. Гэта патрабавала ад уладаў і грамадскіх арганізацый аказання яшчэ аднаго віду дапамогі – інфармацыйна-юрыдычнай. Ужо ў першыя тыдні вайны ў Мінскай губерні былі створаны «Бюро па хадайніцтве пенсій і дапамогі ніжнім воінскім чынам і іх сем'ям». Такія бюро працавалі па ўсёй губерні пры валасных і павятовых папячыцельствах, а ў Мінску пры Гарадскім грамадскім камітэце і аддзяленні Камітэта Вялікай княгіні Елізаветы Фёдараўны. Бюро аказвалі бясплатныя кансультацыі па атрыманні грашовай дапамогі, а таксама дапамагалі ў складанні афіцыйных зваротаў [9, арк. 18].

Яшчэ адным відам дапамогі з боку ўладаў і грамадскасці, уласцівым пераважна сельскай мясцовасці, была працоўная дапамога. Улады імкнуліся заахвоціць сялян да дапамогі ў зборы ўраджаю, засеве палёў і дастаўцы дроў для сем'яў мабілізаваных. Акрамя таго, у першыя месяцы патрыятычнага парыву сялянам аказвалі дапамогу нават мясцовыя памешчыкі. Так, у Амельнянскай воласці Ігуменскага павета памешчык Ратынскі асабіста дапамагаў сем'ям мабілізаваных з засевам палёў [12, арк. 12]. Яшчэ адной

формай дапамогі, якая практыкавалася па ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі, стала стварэнне вучнёўскіх дружын з навучэнцаў і выкладчыкаў, якія дапамагалі па гаспадарцы [4, с. 155]. Акрамя таго, яшчэ ў першы год вайны для сельскагаспадарчых патрэб губернскімі ўладамі была створана сістэма перасовачных абозаў з інструментамі, якія выкарыстоўваліся для дапамогі сем'ям мабілізаваных [8, арк. 25].

Актуальнай для многіх сваякоў ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння ў гарадской мясцовасці была праблема працаўладкавання. У першую чаргу гэта тычылася Мінска. Ужо ў жніўні – верасні 1914 г. пры Мінскім гарадскім камітэце было створана Бюро працы, якое займалася працаўладкаваннем членаў сем'яў ніжніх чыноў, бежанцаў і мясцовых беспрацоўных. Бюро працы брала заказы на пашыў вопраткі і цёплай бялізны, займалася пошукам памяшканняў і працаўнікоў, дапамагала з працаўладкаваннем на заводы і ў пральні лазарэтаў. Усяго, па стане на 1 (14) студзеня 1915 г., у Бюро працы на ўліку былі зарэгістраваныя 2089 чалавек, з якіх 840 з'яўляліся членамі сем'яў вайскоўцаў. На гэты ж час з агульнай колькасці працу атрымалі 1395 чалавек (66,78%) [5, с. 13–16]. Аднак шматтысячныя натоўпы бежанцаў летам-восенню 1915 г. істотна ўскладнілі працу Бюро, а ў далейшым спрыялі павышэнню канкурэнцыі падчас працаўладкавання.

Важным відам дапамогі было апекаванне і выхаванне дзяцей мабілізаваных ніжніх чыноў. Маці дзяцей ніжніх чыноў нярэдка вымушаны былі падпрацоўваць, каб зарабіць дадатковыя грошы. Акрамя таго, існавала нямала дзяцей, для якіх мабілізаваны ў войска мужчына быў адзіным апекуном. Такім чынам, апекаванне дзяцей ніжніх чыноў у значнай ступені залежала ад грамадскіх і прыватных ініцыятыў. Так, у пачатку 1915 г. у Барысаве адкрыўся дзённы прытулак «Яслі» для малалетніх дзяцей мабілізаваных у войска яўрэяў. Прытулак для дзяцей з такой жа назвай існаваў пад патранажам Елізавецінскага камітэта і ў Мінску. Аказвала дапамогу ў апекаванні над дзецьмі ў Мінску і Дабрачыннае таварыства імя Гасударыні Імператрыцы Аляксандры Фёдараўны. У лютым 1915 г. імператрыца асабіста ахвяравала 1400 руб. на стварэнне і дзейнасць прытулку для дзяцей салдат у Мінскай губерні [9, арк. 22]. Мінскае Свята-Мікалаеўскае праваслаўнае брацтва разам з Мінскім домам працавітасці стварылі прытулак для дзяцей-сірот і збіралі для іх грошы. У Мінскім павеце земства фінансавала мясцовы павятовы дзіцячы прытулак на 20 чалавек і прытулак Святой Ірыны на 5 чалавек. У Навагрудку да акупацыі над дзецьмі ніжніх чыноў апекаваў Дамскі кружок Навагрудскага камітэта Чырвонага Крыжа [6, арк. 6–7].

Асобна варта адзначыць дзейнасць у сферы адукацыі Мінскага аддзялення Расійскага таварыства абароны жанчын. Арганізацыя прымала для навучання ў свае нядзельную школу і школу шыцця і кройкі на бясплатнай аснове з поўным забеспячэннем дачок ніжніх чыноў і бежанцаў. Аднак невялікае па памерах памяшканне, якое займаў прытулак таварыства, істотна абмяжоўвала дабрачынныя магчымасці арганізацыі [10, арк. 16–17]. Такім чынам, ні ў Расійскай імперыі, ні ў Мінскай губерні не існавала адзінай цэнтралізаванай сістэмы апекавання над дзецьмі-сіротамі ніжніх чыноў.

Памеры сацыяльнай дапамогі ў Мінскай губерні істотна зменшыліся ў сярэдзіне 1915 г. Можна вылучыць некалькі прычын гэтага. У першую чаргу трэба адзначыць шматразовае павелічэнне колькасці бежанцаў і баявыя дзеянні, якія закранулі і непасрэдна Мінскую губерню. Акрамя таго, самі зборшчыкі ўжо з вясны 1915 г. фіксавалі змены адносін да збораў на ахвяраванне сярод мясцовага насельніцтва. Колькасць ахвяраванняў істотна зменшылася з-за прычыны зніжэння патрыятычных настрояў сярод насельніцтва, расчараванасці ў ходзе вайны, падзення ўзроўню жыцця і росту цэн. У гэтых умовах многія дабрачынныя грамадскія арганізацыі паступова згортвалі сваю дзейнасць або працягвалі зборы ахвяраванняў з меншым энтузіязмам [7, арк. 1–4]. Адпаведна, узровень жыцця сем'яў мабілізаваных таксама зніжаўся. Апошняе адмоўна ўплывала ў тым ліку і на саміх франтавікоў, якія атрымлівалі трывожныя лісты з дому аб галечы, адсутнасці самага неабходнага і разарэнні гаспадарак. Такая тэндэнцыя захавалася на працягу сярэдзіны 1915 – пачатку 1917 г., пакуль у Расійскай імперыі не адбылася Лютаўская рэвалюцыя.

**Заключэнне.** Сістэма сацыяльнай дапамогі сем'ям ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння ў Расійскай імперыі ў перыяд Першай сусветнай вайны грунтавалася на спалучэнні дзяржаўнай і грамадскай дапамогі. Законам ад 25 чэрвеня (8 ліпеня) 1912 г. сем'ям мабілізаваных дзяржава кампенсавала адсутнасць гаспадароў толькі харчовай дапамогай у грашовым эквіваленце. Пры гэтым такую дапамогу маглі атрымаць толькі «законныя» жонка і дзеці (ва ўзросце да 17 гадоў) мабілізаванага. Акрамя таго, дзяржава дапамагала інфармацыйна і юрыдычна – праз стварэнне сетак Бюро па хадайніцтве пенсій і дапамогі ніжнім воінскім чынам і іх сем'ям. Астатнія кірункі неабходнай дапамогі, сярод якіх працоўная дапамога і працаўладкаванне, апека і выхаванне дзяцей, ускладваліся пераважна на грамадскія ініцыятывы. Для апекі і выхавання дзяцей ствараліся адпаведныя ўстановы, якія, аднак, колькасна не маглі прыняць усіх

дзяцей, якія мелі ў гэтым патрэбу. Дапамога з працаўладкаваннем была запатрабаваная пераважна ў гарадах, у той час як у сельскай мясцовасці больш распаўсюджанай з'яўлялася працоўная дапамога ў прыватных гаспадарках. Мясцовыя думы і земствы таксама імкнуліся аказаць дапамогу сем'ям, якія не маглі разлічваць на дзяржаўныя субсідыі ці атрымлівалі іх у недастатковым памеры, аднак магчымасці мясцовых органаў былі вельмі абмежаваныя. Акрамя таго, грашовую, харчовую і працоўную дапамогу імкнулася аказаць і духавенства розных канфесій. Трэба адзначыць, што ў Мінскай губерні ў большасці выпадкаў дзяржаўныя ўлады выконвалі свае абавязкі па сацыяльнай дапамозе і нават імкнуліся рабіць звыш таго, ствараючы па магчымасці больш спрыяльныя ўмовы для адзначаных сем'яў. Актыўна працавалі ў сферы сацыяльнай дапамогі земствы і думы, грамадскія і прыватныя арганізацыі. Аднак гэтых сродкаў ва ўмовах вайны часта было недастаткова. З цягам часу сітуацыя для сем'яў ніжніх чыноў толькі пагаршалася. Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што хібы сістэмы сацыяльнай дапамогі ў Мінскай губерні з'явіліся не па віне мясцовых органаў улады і арганізацый, а з-за недасканалай працы ўсёй дзяржаўнай сістэмы ў сферы сацыяльнай дапамогі насельніцтву. Толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. сістэма сацыяльнай дапамогі адзначаным сем'ям падверглася істотным зменам, якія ўжо не маглі быць падмацаваныя эканамічным патэнцыялам Расійскай дзяржавы

## Спіс літаратуры

1. Грудина А. Д. Государственная помощь семьям нижних чинов российской армии в годы Первой мировой войны: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. Брянск, 2019. 242 с.

2. Булгакова Л. А. Привилегированные бедняки: помощь солдатским семьям в годы Первой мировой войны // На пути к революционным потрясениям. Из истории России второй половины XIX – начала XX века: материалы конф. памяти В. С. Дякина. СПб.; Кишинев: Nestor-Historia, 2001. С. 429–493.

3. Беларусь в годы Первой мировой войны (1914—1918): сб. док. / сост.: В. В. Врублевский [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко (предс.) [и др.]. Минск: Беларусь, 2014. 355 с.

4. Пушкарева Н. Л., Щербинин П. П. Организация призрения семей нижних чинов в годы Первой мировой войны // Журнал исследований социальной политики. 2005. Т. 3. № 2. С. 147–162.

5. Отчет о деятельности Минского городского комитета общественной помощи семьям нижних чинов запаса армии и ратников государственного ополчения, призванных на действительную службу. Минск: Губернская типография, 1915. 31 с.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Фонд 64. Воп. 1. Спр. 3.

7. НГАБ. Фонд 70. Воп. 1. Спр. 1.

8. НГАБ. Фонд 80. Воп. 1. Спр. 1.

9. НГАБ. Фонд 64. Воп. 1. Спр. 1.

10. НГАБ. Фонд 295. Воп. 1. Спр. 8576.

11. Веремейчик А. Е. Несвиж в исторических событиях 1915–1918 гг. // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 лістапада 2018 г. Мінск, 2018. С. 82–87.

12. НГАБ. Фонд 1596. Воп. 6. Спр. 15.

## References

1. Grudina A. D. *Gosudarstvennaya pomoshch' sem'yam nizhnikh chinov rossiyskoy armii v gody Pervoy mirovoy voyny. Dissertatsiya kandidata istoricheskikh nauk* [State assistance to the families of the lower ranks of the Russian army during the First World War. Dissertation PhD (History)]. Bryansk, 2019. 242 p. (In Russian).

2. Bulgakova L. A. Privileged poor: assistance to soldiers' families during the First World War *Na puti k revolyutsionnym potryaseniyam. Iz istorii Rossii vtoroy poloviny XIX – nachala XX veka: materialy konferentsii pamyati V. S. Dyakina* [On the way to revolutionary upheavals. From the history of Russia in the second half of the XIX – early XX centuries: materials of the conference in memory of V. S. Dyakin]. Kishinev, 2001, pp. 429–493 (In Russian).

3. Vrublevsky V.V. *Belarus' v gody Pervoy mirovoy voyny (1914–1918): sbornik dokumentov* [Belarus during the First World War (1914–1918): collection of documents]. Minsk, Belarus' Publ., 2014. 352 p. (In Russian).

4. Pushkareva N. L., Shcherbinin, P. P. Organization of charity families of the lower ranks during the First world war. *Zhurnal issledovaniy sotsial'noy politiki* [Journal of Social Policy Research], 2005, vol. 3, no. 2, pp. 147–162 (In Russian).

*5. Otchet o deyatel'nosti Minskogo gorodskogo komiteta obshchestvennoy pomoshchi sem'yam nizhnikh chinov zapasa armii i ratnikov gosudarstvennogo opolcheniya, prizvannykh na deystvitel'nuyu sluzhbu*

[Report on the activities of the Minsk City Committee of Public Assistance to the Families of the Army Reserve Lower Ranks and State Militia Warriors Called to Active Service]. Minsk, Gubernskaya tipografiya Publ., 1915. 31 p. (In Russian).

6. National Historical Archive of Belarus (NHAB). Fund. 64. I. 1. F. 3.

7. NHAB. Fund. 70. I. 1. F. 1.

8. NHAB. Fund. 80. I. 1. F. 1.

9. NHAB. Fund. 64. I. 1. F. 1.

10. NHAB. Fund. 295. I. 1. F. 8576.

11. Veremeychik A. E. Nesvizh in the historical events of 1915–1918 *Farmiravanne belaruskay dzyarzhaunastsi va umovakh geapalitychnykh zrukhau XX st.: materyyaly Mizhnarodnay navukovay kanferentsyi, Minsk, 29–30 listapada 2018 g.* [Formation of Belarusian statehood in the context of geopolitical shifts of the XX century: materials of the international scientific conference, Minsk, November 29–30, 2018]. Minsk, 2018, pp. 82–87 (In Russian).

12. NHAB. Fund. 1596. I. 6. F. 15.

## Інфармацыя пра аўтара

**Бодрыкаў Яўгеній Аляксандравіч** – магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 6, Рэспубліка Беларусь). E–mail: yaugen.bodrykau@yandex.by

## Information about the author

**Bodrykau Yaugeni Aliaksandravich** – Master of Historical Sciences, PhD student, the Department of Modern and Contemporary History of Belarus. Belarusian State University (6, Nezalezhnastsi Ave., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: yaugen.bodrykau@yandex.by

*Пастуніў 10.03.2023*